# За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 1 (72) Студзень 2013 г.



## Камітэт ААН па правах чалавека абараніў жыхарку Віцебску

**Антаніна Піванос, аштрафаваная ў 2008 годзе за спробу ўручэньня падарунку вядомаму віцебскаму апазыцыянэру Барысу Хамайду, нарэшце дамаглася справядлівасьці: Камітэт ААН па правох чалавека прыняў рашэньне на яе карысьць. Цяпер, згодна з рашэньнем камітэту, беларускія ўлады абавязаныя вярнуць актывістцы канфіскаваную ў яе маёмасьць, пакрыць панесеныя ёй выдаткі і выплаціць кампэнсацыю.**

Маёмасьць, згаданая ў рашэньні камітэту, — гэта габэлен, на якім Антаніна Піванос уласнаручна вышыла словы малітвы «Ойча наш». Гэты габэлен яна хацела падараваць Барысу Хамайду на 80-я ўгодкі абвяшчэньня БНР. Але ледзь падышла яна да «Сіняга дому», дзе спадар Хамайда звычайна распаўсюджвае недзяржаўную прэсу, і разгарнула габэлен, як была схопленая міліцыянтамі. Габэлен адабралі, а саму актывістку затрымалі, на яе склалі пратакол ды даставілі ў суд.

Судовы разбор адбыўся ў дзень затрыманьня, 25 сакавіка 2008 году. Дарма Антаніна Піванос спрабавала давесьці судзьдзю, што ўручэньне падарунку — гэта ніякім чынам ня масавае мерапрыемства. Слухаць яе ніхто не хацеў. Расправа была хуткай: Антаніна Піванос нібыта за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце была пакараная штрафам у памеры дзьвюх базавых велічынь.

Далейшыя спробы абараніць свае правы ў Віцебскім абласным і Вярхоўным судох плёну ня далі. І тады Антаніна Піванос вырашыла зьвярнуцца па абарону ў Камітэт па правох чалавека. Каб дасьледаваць усе акалічнасьці справы і прызнаць, што беларускія ўлады сапраўды парушылі правы актывісткі, камітэту спатрэбілася чатыры з паловай гады.

Згодна з афіцыйным рашэньнем камітэту, улады парушылі артыкул 19 міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох. Частка 2 названага артыкулу надае права жыхарам дзяржаў — удзельніц Пакту, адной зь якіх ёсьць Беларусь, вольна выказваць свае думкі і распаўсюджваць рознага

Антаніна Піванос

кшталту ідэі. Менавіта гэтага права — якое можа быць абмежаванае толькі ў пэўных выпадках: дзеля абароны правоў і рэпутацыі іншых асоб альбо аховы нацыянальнай бясьпекі, грамадзкага ладу, здароўя ці маралі насельніцтва — улады незаконна пазбавілі віцебскую актывістку.

**Антаніна Піванос − ня першая жыхарка Віцебску, якая здолела адстаяць свае правы праз зварот у Камітэт па правох чалавека. Раней станоўчыя рашэньні прымаліся камітэтам па скаргах віцебскіх актывістаў Алены Залескай і Сяргея Белязекі. Нагул жа, паводле сьцверджаньняў праваабаронцаў, апошнім часам жыхары Віцебшчыны, дый усёй Беларусі, не знаходзячы праўды ў беларускіх судох, усё часьцей зьвяртаюцца па дапамогу ў згаданы аўтарытэтны ворган ААН.**

Ці паўплываюць у выніку рашэньні, што раз-пораз прымае камітэт у абарону пацярпелых ад дзеяньняў прадстаўнікоў дзяржавы, на паводзіны беларускіх уладаў? Ці зьменяць яны нарэшце заканадаўчыя акты, каб тыя больш не супярэчылі міжнародным пагадненьням, падпісаным Беларусьсю, і судовую практыку ў краіне?

## Жыхары спаленай вёскі шукаюць справядлівасьці

**Пяцёра жыхароў спаленай вёскі Паўлавічы, што ўвайшла ў склад Першамайскага раёну Віцебску, у пошуках справядлівасьці зьвярнуліся ў пракуратуру, суд і да гарадзкіх чыноўнікаў.** Прычым шукаць справядлівасьці выказалі гатоўнасьць толькі пяць зь дзевяці пацярпелых. Алена Каравіна кажа, што іншыя ня тое што зусім ня вераць у пэрспэктыву гэтай справы, але папросту ня ў стане з-за свайго ўзросту хадзіць па інстанцыях.

Нагадаем: летась 1 сьнежня на ўскрайку гораду спалілі вёску Паўлавічы. Усё адбылося на вачох людзей. Алена Каравіна, Мікалай Голубеў, Георгі Лабачоў, Тацьцяна Уліціна і Андрэй Салаўёў аб'ядналі свае намаганьні супраць тых, хто аддаваў загады паліць пабудовы. Каб паўнавартасна зьвяртацца ў дзяржаўныя структуры, яны падрыхтавалі ўсе неабходныя дакумэнты, у тым ліку даведкі аб аплаце падаткаў на нерухомасьць, на зямлю і г.д.

Зварот у пракуратуру Віцебску з просьбай расьсьледаваць ганебны выпадак падалі таксама праваабаронцы. Адтуль яны атрымалі фармальную адпіску (маўляў, гэта ня вашы дамы палілі, вы ня маеце да справы ніякага дачыненьня), але зварот у Генэральную пракуратуру меў станоўчы вынік — праваабаронцаў запэўнілі, што сытуацыю разгледзяць на месцы па сутнасьці. У выніку Менск усё ж такі даручыў пракуратуры Першамайскага раёну Віцебску высьветліць, наколькі законна дзейнічалі прадстаўнікі гарадзкіх уладаў.

Алена Каравіна шчыра прызналася, што ня надта верыць у посьпех: *"Мы вырашылі дабівацца хаця б кампэнсацыі за нашу зьнішчаную маёмасьць. Мы ня вельмі верым у посьпех, бо самі ж улады і парушылі ўсё што толькі можна было, а мы ім на іх жа і скардзімся. Але ўсё ж спадзяёмся на лепшае. Ва ўсялякім разе трэба дабіцца, каб зь іншымі такога не адбылося. Трэба зрабіць высновы з нашай трагедыі. І чыноўнікі павінны ведаць, што за ўсе свае дзеяньні давядзецца адказваць"*.

## КПЧ чакае ад Беларусі выкананьня рашэньня па справе Кавалёва

Любоў Кавалёва

Маці расстралянага Ўладзіслава Кавалёва Любоў Кавалёва атрымала з упраўленьня Вярхоўнага Камісара паведамленьне пра тое, што яны чакаюць да 3 ліпеня бягучага году ад беларускага ўраду інфармацыі аб прынятых мерах па выкананьні рашэньня Камітэту па правах чалавека ААН па справе яе сына. Беларусь, паводле рашэньня камітэту, павінна прызнаць, што ў адносінах да Ўладзіслава Кавалёва былі парушаныя права на жыцьцё і абарону, прэзумпцыя невінаватасьці і справядлівага судовага разьбіральніцтва, а таксама права перагляду судовага рашэньня.

Праваабаронца Раман Кісьляк, які дапамагае Любові Кавалёвай, спадзяецца, што гэтым разам Беларусь зробіць крок у цывілізаваным накірунку і вернецца да выкананьня сваіх абавязацельстваў, прадугледжаных Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах - апублікуе гэтае рашэньне, а таксама прыме меры, каб такія парушэньні ў будучым не паўтараліся.

# Суд ня зьлітаваўся з інваліда – распаўсюдніка незалежнай прэсы

**Судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску Натальля Карабліна адмовіла ў задавальненьні хадайніцтва распаўсюдніку газэты «Віцебскі Кур'ер» Міхаілу Жураўлёву аб растэрміноўцы выкананьня адміністрацыйнага спагнаньня ў выглядзе штрафу ў памеры 2 500 000 рублёў. Цяпер Міхаіл, які зьяўляецца інвалідам II групы, атрымлівае пэнсію менш за 1 800 000 рублёў і плаціць крэдыт, мусіць ня есьці, ня піць і ўлезьці ў даўгі, каб выканаць пастанову Караблінай аб накладаньні на яго адміністрацыйнага спагнаньня.**

Міхаіл Жураўлёў судзьдзёй Караблінай быў падвергнуты штрафу за распаўсюд газэты «Віцебскі Кур'ер» 22 кастрычніка 2012 году. Судзьдзя віцебскага абласнога суду Ірына Смалякова і старшыня гэтага суду Мікалай Хамічонак ня ўгледзелі падстаў для адмены пастановы судзьдзі Караблінай. У цяперашні час правамернасьць прыцягненьня М. Жураўлёва да адміністрацыйнай адказнасьці разглядаецца ў Вярхоўным судзе Рэспублікі Беларусь. У выпадку пакіданьня пастановы суду ў сіле, М. Жураўлёў мае намер прасіць Камітэт ААН па правах чалавека прызнаць Рэспубліку Беларусь парушальнікам ягонага права на выказваньне думкі - права, гарантаванага артыкулам 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах.

# Беларусь ігнаруе рашэньні КПЧ ААН

**Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь адмаўляецца прызнаваць рашэньні Камітэту па правох чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў.** Пра гэта было паведамлена віцебскаму праваабаронцу **Паўлу Левінаву**, які зьвяртаўся ў МЗС з просьбай інфармаваць яго пра тэрміны, у якія будзе выкананае рашэньне камітэту наконт яго зваротаў, прынятае на 105-й сэсіі камітэту ў ліпені 2012 году.

Павал Левінаў

Павал Левінаў зьвяртаўся ў Камітэт па правох чалавека пасьля неаднаразовых забаронаў з боку Віцебскага гарвыканкаму ладзіць яму пікеты. Перад тым ён спрабаваў абскардзіць гэтыя забароны ў беларускіх судох, але марна. Праваабаронцам было накіравана ў КПЧ дзевяць паведамленьняў, адпаведна колькасьці забароненых пікетаў. З прычыны істотнага фактычнага і юрыдычнага падабенства ўсіх гэтых паведамленьняў, камітэт пастанавіў аб'яднаць іх. Вэрдыкт КПЧ ААН, прыняты адносна зваротаў Паўла Левінава: пазбавіўшы аўтара зваротаў права вольна распаўсюджваць інфармацыю і ідэі, Беларусь парушыла частку 2 артыкулу 19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох.

«Дзяржава-удзельнік абавязаная забясьпечыць аўтара эфэктыўным сродкам прававой абароны, які павінен уключаць у сябе кампэнсацыю, а таксама пакрыцьцё юрыдычных выдаткаў, сплачаных аўтарам. Камітэт прапануе дзяржаве-удзельніку перагледзець адпаведнае заканадаўства аб арганізацыі масавых мерапрыемстваў у мэтах прывядзеньня яго ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі артыкулу 19 Пакту. Дзяржава-удзельнік мусіць таксама забясьпечыць, каб гэткія парушэньні не паўтараліся ў будучыні», — абвяшчаецца ў рашэньні КПЧ ААН па зваротах Паўла Левінава.

Камітэт прасіў беларускія ўлады цягам 180-ці дзён даць інфармацыю пра зробленыя захады па ажыцьцяўленьні сфармуляванай камітэтам пазыцыі, а таксама апублікаваць гэтую пазыцыю і забясьпечыць яе распаўсюд на тэрыторыі краіны на расейскай і беларускай мовах.

180 дзён, адведзеных камітэтам на выкананьне яго рашэньня, мінула. Нічога з таго, што належала, беларускія ўлады не зрабілі. Ніякай кампэнсацыі Павал Левінаў не атрымаў, і, вядома, заканадаўства аб арганізацыі масавых мерапрыемстваў не было зьмененая.

На жаль, гэта стала ўжо завядзёнкай, што ўлады краіны папросту не зважаюць на рашэньні КПЧ ААН. Але цяпер яны пайшлі далей, чымся звычайна. Падчас разьбіральніцтва па справе ў камітэце ў ліставаньні з апошнім беларускі бок заявіў, што ён лічыць паведамленьні Паўла Левінава зарэгістраванымі нібыта ў парушэньне палажэньняў Факультатыўнага пратаколу, таму, маўляў, для іх разгляду дзяржавай-удзельнікам не існуе законных падстаў. Было заяўлена, што дзяржавы-ўдзельнікі не абавязаныя прызнаваць правілы працэдуры камітэту і тлумачэньне імі палажэньняў пратаколу, і што рашэньні, прынятыя камітэтам наконт гэтых паведамленьняў, улады будуць лічыць «несапраўднымі».

Такое беспрэцэдэнтнае стаўленьне Беларусі да рашэньняў КПЧ знайшло сваё адлюстраваньне ў выніковым дакумэнце камітэту па справе: **«Камітэт нагадвае, што пункт 2 артыкулу 39 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох дазваляе яму ўсталёўваць свае ўласныя правілы працэдуры, якія дзяржавы-удзельнікі пагадзіліся прызнаваць. Камітэт адзначае далей, што, зьяўляючыся ўдзельнікам Факультатыўнага пратаколу, дзяржава – удзельнік Пакту прызнае кампэтэнцыю Камітэту па правох чалавека атрымліваць і разглядаць паведамленьні асобаў, якія сьцьвярджаюць, што яны зьяўляюцца ахвярамі парушэньняў любога з правоў, вызначаных у Пакце (прэамбула і артыкул 1). З факту далучэньня дзяржавы да Пратаколу вынікае, што дзяржава бярэ на сябе забавязаньне добрасумленна супрацоўнічаць з Камітэтам».**

**«Любыя дзеяньні, што прадпрымаюцца дзяржавай-удзельнікам, якія перашкаджаюць Камітэту ў справе разгляду і вывучэньня паведамленьняў, а таксама ў паведамленьні сваіх меркаваньняў, або робяць гэтыя дзеяньні Камітэту нікчэмнымі, зьяўляюцца несумяшчальнымі з гэтымі забавязаньнямі. Камітэт сам мае права вызначаць, ці рэгістраваць тую ці іншую справу. Камітэт адзначае, што непрызнаньне кампэтэнцыі Камітэту ў пытаньнях вызначэньня таго, ці трэба рэгістраваць тое ці іншае паведамленьне, як і наўпростая заява пра тое, што дзяржава-удзельнік ня прыме паведамленьне Камітэту пра прымальнасьць і па сутнасьці паведамленьня, зьяўляецца парушэньнем забавязаньняў дзяржавы-удзельніка ў адпаведнасьці з артыкулам 1 Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох»**, — падкрэсьліваецца ў рашэньні КПЧ ААН.

Пакуль усе спробы аўтарытэтнага органу Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў неяк дагрукацца да беларускіх уладаў і пераканаць іх выконваць ўзятыя на сябе ў рамках міжнародных пагадненьняў забавязаньні застаюцца марным лямантам. Улады непахісна стаяць на сваім: *«Вашы паведамленьні былі зарэгістраваныя Камітэтам па правох чалавека ў парушэньне... Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правох... Камітэт праінфармаваны пра тое, што рашэньні, прынятыя па паведамленьнях, зарэгістраваных у парушэньне Факультатыўнага пратаколу, будуць лічыцца несапраўднымі»*, — гаворыцца ў лісьце Паўлу Левінаву зь Міністэрства замежных спраў.

Выходзіць, улады і надалей маюць намер ані ў што ня ставіць рашэньні Камітэту па правох чалавека, і ў беларусаў, такім чынам, ужо не засталося ніякіх сродкаў дзейснай прававой абароны?

# У Віцебску ўчынілі аблаву на геяў і лесьбіянак. Ёсьць затрыманыя

ГейБеларусь
беларускі праваабарончы праект

***У ноч з 12 на 13 студзеня была ўчыненая аблава на наведвальнікаў віцебскага клюбу «XXI стагодзьдзе», дзе ў той час ладзілі вечарыну прадстаўнікі ЛГТБ-супольнасьці. Супрацоўнікі міліцыі і АМАПу ўварваліся ў клюб і запатрабавалі ад тых, хто знаходзіўся ў ім, стаць ля сьценкі, пасьля чаго распачалі праверку дакумэнтаў. Прысутных здымалі на відэакамэру. Сама меней трое наведвальнікаў вечарыны былі затрыманыя.***

*Пра падрабязнасьці інцыдэнту распавёў каардынатар праваабарончага праекту **«ГейБеларусь»** па Віцебскай вобласьці **Максім Гайкоў**:*

— Гэта была звычайная забаўляльная вечарына. Недзе аб 11-й гадзіне вечара прыйшоў нарад з

Максім Гайкоў

двух чалавек у форме. Яны проста стаялі, глядзелі, размаўлялі з гаспадарамі клюбу, якім сказалі, што тут будзе адбывацца нейкая акцыя гомасэксуалістаў. Прастаяўшы ў клюбе каля гадзіны, яны сышлі.

Праз паўгадзіны ўварваліся. Іх было недзе чалавек 20: пяцёра — людзі ў цывільным, астатнія — спэцназ у форме. І на дварэ яшчэ стаялі. У клюбе ў гэты час было чалавек 40-50 наведвальнікаў.

Яны ўварваліся, сабралі ўсіх у адной залі. Хлопцаў направа, дзяўчат налева — усіх расставілі. Адзін зь іх спачатку пайшоў уздоўж шэрагу, у кожнага запытваўся пра дакумэнты. А потым другая чарга пайшла, з запісам на відэакамэру: запытвалі імя, прозьвішча, месца працы ці вучобы, дату нараджэньня і «Што вы тут робіце?».

Адным яны казалі, што шукаюць ухілістаў ад вайсковага абавязку, другім паведамлялі, што гэта наркарэйд — нібыта ім паступіў сыгнал, што ў нас тут пакет марыхуаны недзе ляжыць. Некалькіх чалавек забралі — у камэру, мяркуючы па ўсім. Сама меней вывелі траіх.

У клюбе супрацоўнікі спэцназу знаходзіліся цягам хвілін сарака-пяцідзесяці. А на выхадзе стаялі і пасьля — яшчэ каля гадзіны. Паводзіліся груба, лаяліся вельмі моцна. Старшы сярод іх потым падыйшоў да мяне асабіста, запытаўся, называючы прозьвішча: «Вы?» — «Так, гэта я». — «З вамі мы потым яшчэ паразмаўляем».

*Чым выкліканая гэткая цікавасьць да мерапрыемства ЛГБТ-супольнасьці з боку праваахоўнікаў — незразумела. Але інцыдэнт у Віцебску — ня першы ў шэрагу падобных. Літаральна напярэдадні аналягічныя падзеі здарыліся ў Менску. Там у ноч зь пятніцы на суботу ў клюб «6А», у якім ладзілася гей-вечарына, таксама ўварваліся міліцыянты...*

Бюлетэнь "За правы чалавека" выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта «Віцебская Вясна» і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.